Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»

Факультет начального образования

# СОВРЕМЕННЫЕ ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ НАЧАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

*Материалы II Международной студенческой научно-практической конференции*

*(в рамках Международного форума «Студенческая наука – инновационный потенциал будущего»)*

*г. Минск, 19 апреля 2018 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Научное электронное издание локального распространения*

Минск
БГПУ
2018

**ISBN 978-985-541-517-7**

© Оформление. БГПУ, 2018

УДК 373.3
ББК 74.24
С568

Редакционная коллегия:
*Жданович Н. В.* (отв. ред.), кандидат филологических наук, доцент, декан факультета начального образования БГПУ;
*Азарко О. В.*, кандидат филологических наук, доцент, заместитель декана факультета начального образования БГПУ по учебной работе;
*Сорока О. Г.*, кандидат педагогических наук, доцент, заместитель декана факультета начального образования БГПУ по научной работе;
*Василевская Е. С.,* кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры белорусского и русского языкознания БГПУ;
*Качан О. Г.*, кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры белорусского и русского языкознания БГПУ;
*Баранова Л. И.*, кандидат педагогических наук, доцент, доцент кафедры педагогики и психологии начального образования БГПУ

**Современные** тенденции развития начального образования: материалы II Междунар. студ. науч.-теор. конф., г. Минск, 18 апреля
С568 2018 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол.: Н. В. Жданович (отв. ред.) [и др.]. — Минск : БГПУ, 2018. — 224 с.

ISBN 978-985-541-515-7.

В сборнике представлены результаты исследований студентов, отражающие актуальные вопросы педагогики и психологии начального образования, методик преподавания учебных предметов в начальной школе.

Адресуется преподавателям, аспирантам, студентам и всем, кто интересуется проблемами педагогики, психологии младшего школьного возраста и методик преподавания в начальной школе.

*Минимальные системные требования:*
Операционная система Windows 98 и выше
Процессор Pentium III, RAM 32 Mb (ОЗУ), HDD 250 Mb
Видеоадаптер с разрешением 800×600, 256-цветов,
32 Mb видеопамяти, DVD-ROM, мышь

© Оформление. БГПУ, 2018

*Программное обеспечение:* Adobe Acrobat Reader

Ответственный за выпуск *О. Г. Сорока*
Техническое редактирование и компьютерная верстка *А. А. Покало*
Дизайн обложки *Е. С. Выдрицкой*

Дата подписания к использованию 03.10.18. 2,06 Mb. Тираж 5 электрон. экз. Заказ 621.

*Издатель и полиграфическое исполнение:* учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка».

Свидетельство о государственной регистрации издателя печатных изданий № 1/236 от 24.03.14.
ЛП № 02330/448 от 18.12.13. Ул. Советская, 18, 220030, Минск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# БЕЛАРУСКІЯ ВЕРШАВАНЫЯ АЗБУКІ: ТРАДЫЦЫІ І НАВАТАРСТВА Ў СТВАРЭННІ

# BELARUSIAN POETIC ALPHABET: TRADITION AND INNOVATION IN CREATING

*К.У. Капітула*

*K. Kapitula*

БДПУ, Мінск

Нав. кір. – Васілеўская А.С., канд. філал. навук, дацэнт

У артыкуле разгладаюцца прыёмы знаёмства з літарамі, што абазначаюць галосныя гукі, у вершаваных азбуках беларускіх пісьменнікаў, адзначаюцца традыцыйныя і наватарскія рысы гэтых азбук.

Ключавыя словы: вершаваная азбука, літары, якія абазначаюць галосныя гукі, прыёмы, жанравыя асаблівасці.

The article deals with receptions for acquaintance with letters, which denote vowel sounds, in Belarusian poetic alphabets, traditional and innovative features of these alphabets are noted.

Key words: poetic alphabet, letters, which denote vowel sounds, reception, genre features.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вершаваная азбука – гэта своеасаблівы паэтычны жанр, які з аднаго боку накіраваны на вырашэнне вучэбных задач, а з другога – стварае вобразныя ўяўленні пра літары [5]. Вершаваная азбука як паэтычны жанр мае сталы ўзрост: першая славянская вершаваная азбука была напісана, як сцвярджаюць вучоныя, стваральнікам славянскай пісьменнасці Кірылам.

Асноўнае прызначэнне вершаваных азбук – знаёмства з напісаннем літар, з іх гукавым значэннем, асваенне найбольш частотных слоў з гэтымі літарамі. Вершаваная форма азбукі з яе мілагучнасцю, музычнасцю, зладжанасцю гукаў дапамагае больш хуткаму засваенню і запамінанню вучэбнага матэрыялу. А вобразныя «пераўтварэнні» літар дапамагаюць развіваць дзіцячае ўяўленне і фантазію.

За доўгі час развіцця вершаваныя азбукі набылі свае жанравыя асаблівасці, да якіх адносяцца размяшчэнне літар строга ў алфавітным парадку, акцэнт на перадачу формы літары праз параўнанне яе з рознымі прадметамі, выкарыстанне рознага віду моўных гульняў для лепшага засваення гукавога значэння літары, нанізванне слоў з пэўнымі літарамі [5].

Мы прааналізавалі вершаваныя азбукі Рыгора Барадуліна [1], Васіля Віткі [2], Артура Вольскага [3] і Міколы Маляўкі [4], каб выявіць у іх традыцыйныя і наватарскія рысы. Мы разгледзім, як у выбраных вершаваных азбуках падаюцца літары, што абазначаюць галосных гукі.

Першы прыём, які часцей за ўсё ўжываецца у вершаваных азбуках і які выкарыстоўваюць беларускія аўтары, – гэта знаёмства з графічнай формай літары. Робіцца гэта праз параўнанне літары са знаёмымі дзецям прадметамі – елка, рагатка, палка, маладзічок і інш.:

Е чарнела за лясамі,
Быццам елка ў тры сукі [1].

З плота выламана палка.
І на палку села галка.
І не круціцца – ані!
Паглядзіце: вось вам І [3]

Прыдумаў верабейка ў школе
Вясёлую загадку:
«Якая літара найболей
Падобна на рагатку?» [4]

Наступны традыцыйны прыём, якім карыстаюцца аўтары беларускіх вершаваных азбук, — гэта падача значнай колькасці слоў, якія або пачынаюцца з пэўнай літары (Ёрш, узлессе, экзамен, ювелір, яга і інш.), або пачынаюцца і заканчваюцца адной і той жа літарай (Евангелле, указку і інш.):

А У зрабіла ласку –
Прынесла ў клас УКАЗКУ,
І ў УМЫВАЛЬНІК, як заўжды,
Пасмела У наліть вады.
Не возьме ВУДЫ ў дзеда з рук
Без гэтай літары
УНУК [4].

Ёрш сагрэць спрабуе лёд.
Апякае палец ёд [1].

Юра гойсае вясёлы,
Ён ганяе нібы кола
Той абруч, сарваны з бочкі,
Што ад нас падаўся ўпрочкі.
Юра, юшка – Ю нідзе
З гэтых слоў не прападзе [3].

Такі прыём дазваляе пашырыць слоўнікавы запас вучняў, актывізаваць найбольш ужывальную лексіку.
Звяртаюцца беларускія аўтра і да розных моўных гульняў, якія патрабуюць ад вучняў назіральнасці і пільнасці:

«Шукайце!» –
Кліча вас
Яна, залезшы ў ВЕЖУ [4].

Ды І пастаўце блізка
Сюды, да слова РЫСКА, –
І вось яна,
ІРЫСКА! [4]

Аднак практычна ў кожнага аўтара ёсць свае адметныя прыёмы стварэння вершаванай азбукі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Так, М.Маляўка акцэнтуе ўвагу на тое, што літары ў алфавіце – гэта вялікая і дружная сям‘я, дзе ўсе цесна звязаны паміж сабой. Навучыцца чытаць і пісаць можна толькі вывучыўшы ўсе літары:

Дык біце, біце ў ладкі:
Нарэшце ўся,
Ад А да Я,
Сышлася на калядкі
Вясёлых літараў
Сям’я [4].

Васіль Вітка для знаёмства з літарамі стварае цікавыя жанравыя сцэнкі, якія маюць не толькі навучальнае, але і выхаваўчае значэнне:

— Індык, – спытаў Вася, –
А ты куды сабраўся –
Ў гурток шыцця і кройкі?
Дзеля чаго ў запасе
Ў хвасце ў цябе іголкі?
Чаго ты так надзьмуўся,
Ад вучняў адвярнуўся?
— Хаджу я важна па зямлі, –
Затрос індык бародкаю, –
Бо ведаю, што ёсць два і:
І доўгае, Й кароткае.
Усё я ведаю, пытай.
Напрыклад: іней, гай і май,
Ігнат, Іван, Іран…
— А бэ-э-э? – не вытрываў баран. –
Не паважаю я цябе,
Бо ты сказаць не ўмееш: бэ!

Спакойна Васева рука
Лягла на дзённік індыка.
— Ты адказаў мне бойка, –
Сказаў настаўнік Вася, –
Але я стаўлю тройку,
Каб больш не зазнаваўся [2].

У азбуцы Р.Барадуліна прасочваецца моцная нацыянальная ідэя:

Окае ўкраінскі брат.
Ты заокаеш наўрад.
Пракрычаў арол з-пад неба:
— Беларусу акаць трэба! [1]

Такім чынам, кожны аўтар па-свойму падыходзіць да стварэння вершаванай азбукі. У беларускіх тэкстах можна ўбачыць як традыцыйныя асаблівасці гэтага жанру, так і наватарскія знаходкі і падыходы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Літаратура


1. Барадулін, Р. Азбука – вясёлы вулей : вершы : для дашк. і малод. шк. ўзросту / Р. Барадулін. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 29 с.

2. Вітка, В. Азбука Васі Вясёлкіна : казка : для дашк. узросту / В. Вітка. – Мінск : Юнацтва, 1988. – 32 с.

3. Вольскі, А. Жывыя літары : вершы : для дашк. узросту / А. Вольскі. – Мінск : Маст. літ., 1973. – 32 с.

4. Маляўка, М. Літары-сваячкі. Буквар у вершах / М. Маляўка // Аз + Букі : верш. азбукі : для мал. шк. ўзросту ; уклад. Т. Тарасава. – Мінск : Маст. літ., 2004. – С. 30–40.

5. Троицкая, Т. С. Поэтические азбуки : подвижность и устойчивость жанровой модели [Электронный ресурс] / Т. С. Троицкая. – Режим доступа: http://setilab.ru/troi/wp-content/uploads/2007/12/poetic-alphabets.pdf. – Дата доступа: 7.04.2017.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ